**Фонды ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка” у 2023 годзе папоўніліся новымі кнігамі беларускіх аўтараў. Шмат тэм у вершах, поэмах, эсэ, раманы ў жанры дэтэктыва, прыгод, рамантыкі нікога не пакіне раўнадушным. Новыя кнігі беларускіх пісьменнікаў увайшлі ў свет сучаснай літаратуры. Прыемнага чытання.**




**Стэльмах, Алена.**
**Слова за словам : публіцыстычны зборнік / Алена Стэльмах ; прадм. Алеся Марціновіча. — Мінск : Звязда, 2022. — 176, [16] с. : іл.— 16+.**

Зборнік публіцыстычных матэрыялаў Алены Стэльмах складаецца з нарысаў, інтэрв’ю, водгукаў, эсэ і рэцэнзій. Багатая палітра жанраў дазваляе разнабакова і шырока прадставіць свет літаратуры. Кніга будзе карыснай для ўсіх, хто цікавіцца літаратурай і літаратуразнаўствам і жадае паглыбіць свае веды ў галіне мастацкай публіцыстыкі.




**Марозаў, Змітрок.**
**Парог сумлення : вершы, санеты, вянкі санетаў / Змітрок Марозаў. — Мінск : Беларусь, 2023. — 167 с. : іл. — 16+.**

Лірычны герой кнігі – наш сучаснік, які імкнецца асэнсаваць тыя перамены, якія адбываюцца ў грамадстве і свеце, жыцці і свядомасці людзей. Ён прагне спасцігнуць таямніцу свайго прыходу на Зямлю, паэтычнымі сродкамі акрэсліць сваё прызначэнне і месца ў нашым няпростым, супярэчлівым часе.

Прачулыя паэтычныя радкі, прысвечаныя харастве роднай Беларусі, дарагім сэрцу продкам і землякам – сціплым вясковым працаўнікам, кранаюць сэрца чытача сваёй шчырасцю. Вернасць традыцыям і гераічнай памяці нашага народа, любоў да матчынай мовы, пачуццё светлай любові да каханай жанчыны і маці, непрымірымасць да абыякавасці і бяздушша – вось вызначальныя тэмы паэтычнага зборніка.






**Басікірская, Алена.**
**Мая зямля — яна мая да скону : вершы і паэма / Алена Басікірская. — Мінск : Звязда, 2023. — 143 с. : іл. — 16+.**

У паэтычны зборнік увайшлі вершы, прысвечаныя роднай краіне і яе слаўнаму мінуламу, мілагучнай беларускай мове, а таксама Міёршчыне, малой радзіме аўтара. Асобную нізку складае інтымная лірыка. Таксама ў кнігу ўключаны пераклады на беларускую мову твораў А. Пушкіна, М. Лермантава, С. Ясеніна, А. Хаяма і іншых класікаў і паэма, якая друкуецца ўпершыню.




**Башлакоў, Міхась**
**На зветраных шляхах : вершы / Міхась Башлакоў. — Мінск : Беларусь, 2020. — 351 с.**

Новую кнігу паэзіі лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міхася Башлакова склалі вершы, напісаныя за тры гады (2017—2019).

“Без сумлення няма паэта” — нязменнае творчае і жыццёвае крэда паэта. Шырокі тэматычны дыяпазон і шматколерная настраёвая танальнасць пранікнута у вершах. Побач з лірычнымі пейзажна-акварэльнымі радкамі гучыць эпічная, грамадзянска-патрыятычная паэзія, пранізаная трывожным роздумам і горкім несціханым болем за лёс Айчыны і народа, за лёс роднай мовы і мастацкага слова…




**Гальпяровіч, Навум**
**Ветразь лёсу : вершы, паэма / Навум Гальпяровіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. — 125, [1] с. — 12+.**

Аўтар раскрывае душу перад чытачамі, нібыта птушка расхінае крылы. Менавіта такое адчуванне пасля прачытання кнігі Навума Гальпяровіча «Ветразь лёсу».

Вершы Навума Гальпяровіча даўно заслужылі ўвагу і выклікалі цікавасць у беларускіх чытачоў. Яны прываблiваюць глыбокай лірычнасцю, шчырасцю, прасякнуты любоўю аўтара да Радзімы і свайго роднага Полацка». У кнізе і вершы, напісаныя нядаўна, і выбраныя творы розных гадоў.




**Першацвет : проза і паэзія маладых / [рэдакцыйны савет: А.М. Карлюкевіч (старшыня) і інш. : прадмова А. Карлюкевіча]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2017. (у пераплеце)**
**Вып. 6 — Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. — 118 с. — 16+.**

Пад стылёвай вокладкай — творы пераможцаў Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Першацвет». Сярод сотняў дасланых на конкурс вершаў, апавяданняў, эсэ былі адабраныя творы дзесяці паэтаў і дзесяці празаікаў на рускай і беларускай мовах. Традыцыя, эксперымент, а якія цікавыя біяграфіі!....




**Шніп, Віктар Анатолевіч (пісьменнік ; нар. 1960). Заўтра была адліга — 3 : дзённікавы раман паэта / Віктар Шніп. — Мінск : Звязда, 2023. — 269, [2] с. — 2018. — 16+.**

"Заўтра была адліга – 3" – працяг дзённікавага рамана, з папярэднімі часткамі якога чытач пазнаёміўся праз кнігі Віктара Шніпа "Пугачоўскі цырульнік" (2013), "Заўтра была адліга" (2015), "Трава бясконцасці" (2018) і "Заўтра была адліга – 2" (2022). Дык пра што ж кніга? Калі коратка – пра штодзённасць, якую ўсе мы пражываем, часта не заўважаючы надзвычай важнага. Аўтар не толькі заўважыў, але і занатаваў яркія моманты з быцця сваіх родных і блізкіх, нечаканыя факты з біяграфій вядомых людзей, мітрэнгі рэдактарскай працы, вандроўкі ў снах і наяве, а таксама вершы, якія нечакана прыдумаліся ў дарозе. І ўсё гэта разам сплялося ў цікавую празаічна-паэтычную гісторыю, чытаючы якую можна і засмяяцца, і заплакаць, і задумацца.




**Зуёнак В.В.**
**Паўстанак з літарай “Л” : элегіі / Васіль Зуёнак ; прадм. А. Кудравец ; уклад. Н. Заяц . — Мінск : Чатыры чвэрці, 2021. — 232 с. : іл. — 12+.**

Гэтую кнігу Васіля Зуёнка складаюць празаічныя элегіі, якія ўпершыню публікуюцца асобным выданнем. Аўтар невыпадкова так назваў сваю прозу: у творах раскрываюцца складаныя, часта драматычныя перыпетыі жыцця галоўных герояў, паказваецца іх сутыкненне з неспрыяльнымі абставінамі. Пісьменнік запрашае чытача зазірнуць у душу “маленькага чалавека”, радасці якога нярэдка абарочваюцца стратамі…”.